УДК 371.385.4

# ВЫВУЧЭННЕ ЛІТАРАТУРНЫХ ПСЕЎДАНІМАЎ ПРАЗ ДАСЛЕДЧУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ

**Цімохава Ірына Уладзіміраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
ўстановы адукацыі "Гімназія г. Быхава"
(г. Быхаў, Беларусь)

Даследчая дзейнасць – гэта накірунак, які дазваляе сфарміраваць у вучняў неабходныя якасці: уменне аналізаваць, параўноўваць, абагульняць, рабіць высновы.

У паўсядзённым жыцці мы карыстаемся інтэрнэтам, ужываем "логіны" і "нікі", замяняючы сваё імя, нават не звяртаючы ўвагі на іх сэнс. Жыццё – з'ява хуткаплынная. Імя – гэта тое, што застаецца пасля нас. Разважаючы на гэту тэму, мы мімаволі задумаліся пра псеўданімы вядомых пісьменнікаў. Чаму пісьменнікі бралі сабе псеўданімы? Якое сэнсавае значэнне яны нясуць? З гэтых пытанняў пачалося наша даследаванне. "Паходжанне і ўтварэнне літаратурных псеўданімаў" – так была акрэслена тэма даследчай работы вучняў 10 класа ўстановы адукацыі "Гімназія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

г. Быхава”. У бягучым годзе работа была адзначана дыпломам І ступені на Рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару (канферэнцыі) у секцыі “Літаратуразнаўства”.

Мэта даследавання − вывучэнне з’яўлення літаратурных псеўданімаў, тлумачэнне псеўданімаў вядомых пісьменнікаў. Каб дасягнуць мэты, былі вызначаны наступныя задачы: азнаёміцца з гісторыяй узнікнення літаратурных псеўданімаў; выявіць прычыны ўзнікнення псеўданімаў; указаць іх разнавіднасці; даследаваць псеўданімы Максіма Багдановіча, Самуіла Плаўніка, Алаізы Пашкевіч і выявіць іх узаемазувязь з жыццём і творчасцю пісьменнікаў; скласці даведнік літаратурных псеўданімаў.

Прадметам даследавання з’яўляюцца псеўданімы беларускіх пісьменнікаў – юбіляраў 2016 года, якімі з’яўляліся Максім Багдановіч, Алаіза Пашкевіч, Самуіл Плаўнік.

Актуальнасць і выбар тэмы вызначыліся наступнымі фактарамі:

па-першае, неабходна развіваць і папулярызаваць беларускую мову, выхоўваць павагу і любоў да гісторыі, літаратуры, культуры беларускага народа; па-другое, даследаванне спрыяе фарміраванню і развіццю культурнага і грамадзянскага ўзроўню асобы; па-трэцяе, вывучэнне псеўданімаў дазваляе дакладна ўявіць асобу аўтара і зразумець яго творчасць, арыентавацца ў літаратурна-гістарычным працэсе. Аб’ектам вывучэння сталі жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, фотаздымкі, інтэрв’ю, артыкулы.

Пры правядзенні даследавання выкарыстоўваўся метады: аналітычны (аналіз навукова-метадычнай літаратуры, аналіз жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў, артыкулаў з перыядычнага друку, фотаздымкаў), анкетаванне.

Вучні сістэматызавалі звесткі з гісторыі ўзнікнення псеўданімаў, указвалі прычыны, якія прымушалі пісьменнікаў браць сабе другое імя. Трэба заўважыць, што ў Беларусі зборам і вывучэннем псеўданімаў займаўся Янка Саламевіч. Ён і з’яўляецца аўтарам першага беларускага слоўніка псеўданімаў. Прычын узнікнення псеўданімаў мноства. Самымі распаўсюджанымі з’яўляюцца цяжкія цэнзурныя ўмовы, жаданне пазбегнуць праследавання. Заўважым, што ва ўсе часы і ў розных краінах прычыны ўзнікнення псеўданімаў падобныя.

Аўтар першага беларускага слоўніка псеўданімаў Янка Саламевіч пачаў сваю дзейнасць з псеўданіма **Самуіла Плаўніка** (130 гадоў са дня нараджэння) – Ясакар. Іван Навуменка ўдала патлумачыў яго: “*Ясакар* – пірамідальная таполя. Уражанне такое, што дрэва гэтае, нібы страла, ірвецца ў неба. Паэзія Самуіла Плаўніка таксама як бы імкнулася ў паднябессе” [1, с. 4]. Класік беларускай літаратуры Самуіл Плаўнік больш вядомы чытачам пад псеўданімам *Змітрок Бядуля.* Мы высветлілі, што гэты псеўданім



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фальклорнага паходжання. У беларускіх казках, якія малады таленавіты пісьменнік збіраў і вывучаў, ёсць вобраз добрага спагадлівага дзядка Бядулі, які ходзіць па свеце і суцяшае пакінутых бацькамі дзяцей – сірот і бяздомнікаў. Такім чынам, псеўданім падкрэсліваў еднасць пісьменніка з народам.

**Максім Багдановіч** таксама даволі часта выступаў у друку пад псеўданімамі (125-годдзе паэта ў 2016 годзе адзначала ўся беларуская грамадскасць). Каб залішне не мільгала перад вачамі яго прозвішча, многія матэрыялы аўтар вымушаны быў падпісваць крыптанімамі і псеўданімамі. Таксама, падманваючы чытачоў, ён карыстаўся і жаночымі формамі псеўданімаў. Так, у яраслаўскай газеце “Голос” верш “Восенню” падпісаны *Катерина Февралёва*. Успаміны суайчыннікаў дапамагаюць глыбей зразумець Максіма Багдановіча як пісьменніка і як чалавека. Ён быў засмучаны, што не можа мець сваіх дзяцей, а выказаць яго бацькоўскія пачуцці дапамог верш, напісаны нібы ад імя жанчыны.

У беларускай літаратуры пад псеўданімам вядома **Алаіза Пашкевіч** (140 год са дня нараджэння) – выдатная беларуская паэтэса і грамадскі дзеяч. Паэтка звычайна хавалася пад мужчынскімі прозвішчамі (*Гаўрыла, Гаўрыла з Полацка, Крапіўка, Мацей Крапіўка*). Аднак трывала замацаваўся за ёю менавіта “жаночы” псеўданім *Цётка*. Прааналізаваўшы жыццё і творчасць Алаізы Пашкевіч, мы звярнулі ўвагу на пэўныя факты:

– яна працавала для дзяцей: выдавала кнігі і падручнікі, часопіс для моладзі; публіцыстычныя артыкулы *Цёткі* адрасаваны пераважна моладзі і прысвечаны важным і актуальным пытанням свайго часу – развіццю беларускай асветы і нацыянальнай культуры;

– характэрныя рысы паэзіі – рэвалюцыйны пафас, вернасць вольналюбівым ідэалам у цяжкія гады рэакцыі, патрыятызм, служэнне народу, змаганне за лепшае жыццё;

– з успамінаў яе брата Войцеха Пашкевіча: “Яна дзялілася апошнім кавалкам хлеба з тым, каму была патрэба. Яе альтруізм даходзіў да самазабыцця, і трэба было пільнаваць, каб сама з’ела абед, што мела – усё раздавала” [2].

Такім чынам, мы прыйшлі да высновы, што Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч сапраўды была чалавекам чуйным, уважлівым да людзей, справядлівым, міласэрным, адданым сваёй справе. Яе душа была напоўнена цяплом і мацярынскай любоўю. “Цётка” – бацькава або матчына сястра, жонка дзядзькі, іншымі словамі – родны чалавек. Ці мог замацавацца іншы псеўданім за Алаізай Пашкевіч? Зразумела, не мог.

Матэрыялам нашай работы даследчага характару сталі псеўданімы пісьменнікаў. У выніку даследавання было апрацавана 237 псеўданімаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

якія ўвайшлі ў слоўнік і выкарыстоўваўся ў працы на ўроках беларускай літаратуры.

Канечне, вучнёўская даследчая работа карэнным чынам адрозніваецца ад акадэмічных навуковых даследаванняў. Аднак варта заўважыць, што менавіта падчас школьнага навучання закладваюцца навыкі пошукавай дзейнасці абгрунтаваныя жаданнем знайсці адказы на праблемныя пытанні, высветліць прычыны пэўных акалічнасцей і з'яў, зазірнуць у гісторыю.

Вывучэнне жыццёвых шляхоў юбіляраў дапамагло растлумачыць прычыны, якія прымусілі А. Пашкевіч, М. Багдановіча, С. Плаўніка карыстацца псеўданімамі, а таксама раскрыць значэнне гэтых псеўданімаў. Атрыманая інфармацыя дапамагла па-новаму паглядзець на творчыя асобы Алаізы Пашкевіч, Максіма Багдановіча, Самуіла Плаўніка, глыбей зразумець іх творчасць.

**Літаратура**


1. Навуменка, І. Я. Змітрок Бядуля / І. Я. Навуменка. − Мінск : Беларуская навука, 2004. – 227 с.
2. Виртуальный музей Щучинского района [Электронны рэсурс ]. – Рэжым доступу: http://virtual-museum.shhuchin.edu.by/. − Дата доступу: 12.02.2017.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова